PATER NOSTER

„Я ёсьць дарога, праўда
й жыцьцё”

(Ян 14:6)

№1 (51)
сакавік
2010

Выданьне рымска-каталіцкай парафіі сьвятога Казіміра ў Жлобіне

# Сьвяты Казімір, маліся за нас!

**Кожны год у пачатку сакавіка пры любым надвор'і кірмаш у Вільні расьцвітае кветкамі і вербамі сьвятога Казіміра. А пачалося гэтае сьвята чатыры стагодзьдзі назад...**



Кароль Казімір Ягелон (1427–1492) меў ад жонкі Альжбеты, малодшай дачкі цэсара Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі Альбэрта II, пяць сыноў: зь іх Уладыслаў, Ян Ольбрахт, Аляксандар і Жыгімонт I сталі каралямі, Фрэдэрык – кардыналам арцыбіскупам Гнезьненскім. Другому сыну, Казіміру, які нарадзіўся на сьвітанку 3 кастрычніка 1458 г., выпала праславіцца як сьвятому, стаць апекуном Вялікага Княства Літоўскага. Казімір Ягелон выбраў у якасьці «другога бацькі» для сваіх сыноў гісторыка, пісьменьніка-гуманіста і дыплямата Яна Длугаша (1415–1480). Ён адмовіўся ад пасады кароннага падканцлера, арцыбіскупа праскага, і застаўся сьціплым кракаўскім канонікам. Быў каралеўскім паслом у Рыме, Чэхіі і Венгрыі, удзельнічаў у заключэньні вечнага міру з крыжацкім законам. Ён першы прывёз у Кракаў творы антычных клясыкаў, напісаў гісторыю Каралеўства Польскага, у якой падаў шмат зьвестак пра падзеі XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім. (Між іншым, дзякуючы Длугашу мы ведаем пра мастакоў «зь Літвы», якія ў XV ст. размалявалі «візантыйскімі» росьпісамі касьцёлы ў Малой Польшчы.) Наведаўшы як паломнік Палестыну, ён выбраў адзіноту і сьвяты супакой. Каралеўскі кракаўскі двор з магнацкімі інтрыгамі і забавамі кароль лічыў ня лепшым месцам падрыхтоўкі да жыцьця спадкаемцаў трона і выбраў для выхаваньня маладых каралевічаў ціхі замак у Старым Сончу. Там яны вялі размеранае і сьціплае жыццё з рэдкімі забавамі.

**Працяг на 2 стар.**

# Ад рэдакцыі

Дарагія нашыя чытачы!

Больш за год не сустракаліся мы з вамі на старонках нашае газэты. Як Вы памятаеце, апошні нумар выйшаў у студзені 2009 года. Крызіс, які ўскалыхнуў сьвет, закрануў таксама й нашае выданьне.

Нельга сказаць, што прычынамі нявыхаду газэты былі толькі матэрыяльныя - хапала таксама іншых праблемаў.

Аднак сёньня мы аддаем у Вашыя рукі новы нумар газэты «Pater Noster». Спадзяемся, што дзякуючы Вашым малітвам, матэрыяльнай дапамозе і гатоўнасьці прысьвяціць крыху ўласнага вольнага часу для ўдзелу ў стварэньні газэты, мы будзем ізноў бачыцца з Вамі штомесяц без перапынку. Насамрэч, гэта ў вялікай ступені залежыць ад Вас, шаноўныя чытачы.

Заклікаем Вас таксама да дасыланьня на адрас рэдакцыі Вашых артыкулаў, лістоў, гісторый, разважаньняў. Найлепшыя працы мы будзем друкаваць на старонках нашай газэты. Памятайце, што газэта ствараецца для Вас і Вамі - вернікамі. Давайце ж разам пераадольваць тыя цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху нашага выданьня.

Шчыра дзякую ўсім, хто спрычыніўся да паўстаньня гэтага нумару і запрашаю да чытаньня.

**Алесь Карцель**

# Сьвяты Казімір,

працяг. пач. на 1 стар.

Калі кароль зь сям'ёй прыязджаў у Вільню, Длугаш вывозіў юнага Казіміра для малітвы і працы ў Медніцкі замак. Длугаш, верагодна, не рыхтаваў сына караля для духоўнай кар'еры. Больш за тое, у 1471 г., калі Казіміру было ўсяго 13 гадоў, венгры выбралі яго сваім каралём, і юны каралевіч зь яшчэ маладзейшымі братамі і войскам накіраваўся ў Венгрыю. Аднак там другая партыя дваранства з 1457 г. падтрымлівала Мацея Корвіна, і палякі, не адважыўшыся пачаць міжусобную вайну перад тварам блізкай турэцкай пагрозы, мусілі вярнуцца назад. Магчыма, гэты эпізод яшчэ больш зьвярнуў позірк Казіміра да нябеснага Валадарства. Тым ня менш, кароль пакінуў Казіміра ў Вільні замест Яна Альберта (за якога ў 1477 г. хадайнічалі літоўскія паны), але ён нязьменна, як і раней, вёў у Ніжнім замку адасобленае і ціхае жыцьцё, і яго, як пісаў аўтар першай біяграфіі сьвятога З.Фэрэры, часьцей бачылі ў касьцёле, чым у палацы. Як насьледніка кароны кароль спрабаваў далучыць сына да кіраваньня дзяржавай, пакінуўшы яго на час сваёй адсутнасьці ў 1481–1483 гг. намесьнікам у Польшчы.

Пра незвычайную, узьнёслую набожнасьць каралевіча Казіміра пісалі ўсе ягоныя біёграфы, ад Захарыя Фэрэры і Пятра Скаргі да аўтараў XIX ст. «На самым ранку, як толькі адчыняліся дзьверы сьвятыні, сьвяты каралевіч ужо кленчыў перад алтаром, з узнесенай душой, у постаці натхнёнай і разам з тым пакорнай і пакутніцкай, і заставаўся ў касьцёле, пакуль яго не зачынялі. Тут ён забываўся пра ўсе патрэбы цела: не адчуваў голаду, холаду, стомленасьці; быў нібы ў сьвятой зачараванасьці, імгненным, але бесьсмяротным разрыве зь целам... Сярод цёмнай ночы зрываўся з пасьцёлі, тайком выходзіў з пакою, адзін, босы прыбягаў да замкавай сьвятыні, і, найчасьцей знайшоўшы яе замкнёнай, клаўся ніц перад яе парогам, акрапляў яго сьлязьмі і ў сьвятым узьнясеньні малітвы заставаўся да сьвітанку...» У натхнёных вершах напісаў гімн Багародзіцы «*Omni Dei*», вядомы пад яго іменем і ўжываны ў касьцёле ад 1499 г. У 1483 г. хворы на сухоты Казімір прыехаў у Вільню, а на Калядны наведаў Гродна. Здароўе яго хутка пагаршалася, і 1 сакавіка яго перавезьлі ў Вільню. Памёр Казімір на сьвітанку ў чацьвер 4 сакавіка 1484 г. у Ніжнім замку на 26-м годзе жыцьця. Яго цела было ўрачыста пахавана ў капліцы віленскай катэдры, закладзенай каралём Казімірам.

Першыя дакумэнтальныя зьвесткі аб сьвятасьці каралевіча Казіміра і цудах, што адбываліся пры яго пахаваньні, вядомыя з прамовы перад папам Аляксандрам VI пробашча віленскай катэдры Эразма Цёлка, пасла князя Аляксандра (1501 г.). У папскай буле ад 15 траўня 1501 г. для капліцы ў катэдры яшчэ асьцярожна гаворыцца, што ў ёй пахаваны князь Казімір і «пры магіле яго, як кажуць, адбываюцца цуды». На радзіме сьвятасьць Казіміра ўжо ў пачатку XVI ст. лічылася бясспрэчнай. Канцлер каралевы і паэт-гуманіст Андрэй Крыцкі ў вершы 1513 г. зьвяртаўся да Казіміра з просьбай заступіцца перад Богам за брата Жыгімонта ў барацьбе з Масквою за Смаленск.

У 1516 г. біскуп Война Радзівіл і віленская капітула, бернардынцы зь Вільні, а таксама Жыгімонт I накіравалі да папы Льва X лісты з просьбай прызнаць Казіміра сьвятым. Кароль у лісьце ад 10 траўня 1516 г. нагадваў, што зьвяртаецца з гэтай просьбай ужо трэці раз і пісаў, што пры гробе Казіміра ўсё часьцей здараюцца цуды. У наступным годзе ў Рым выправілася сьпецыяльнае пасольства ад караля, капітулы і ўладаў, і 4 лістапада 1517 г. пытаньне вырашалася на калегіі кардыналаў. Атрымаўшы адпаведнае ўказаньне з Рыма, прымас Ян Ласкі з Войцехам Радзівілам правялі ў Вільні ўступны працэс кананізацыі і адаслалі акты ў Рым. 15 верасьня 1519 г. Леон X вырашыў накіраваць у Вільню легата біскупа Захарыя Фэрэры, каб той на месцы праверыў «ці той Казімір, аб якім так многа гавораць, сапраўды заслугоўвае пашаны, што належыць сьвятым, не з-за яго каралеўскага паходжаньня, але з-за цнотаў і сьвятасьці жыцьця». Прыбыўшы 2 верасьня 1520 г. у Вільню, Фэрэры і камісія з трох біскупаў азнаёміліся з запісамі пра цуды і выслухалі сьведкаў. На гэтай падставе легат склаў *«Vita beati Casimiri confessori»* (датавана 1 сьнежня 1520 г.), ён жа падрыхтаваў *Officium breviarum i Missalum* на дзень сьв. Казіміра. З матэрыяламі камісіі ў Рым зноў адправіўся Эразм Цёлак. Аднак працэс кананізацыі так і ня быў завершаны ў Рыме. 1 верасьня 1521 г. памёр «апошні рэнэсансавы папа» Леў X (Джавані Мэдзічы), да таго ж у час рабунку Рыма ў 1527 г. прапалі акты папскай тайнай канцылярыі, у тым ліку дакументы камісіі Фэрэры. У 1539 г. Жыгімонт I яшчэ раз папрасіў Паўла III паскорыць кананізацыю Казіміра, аднак у гэты час у Сьвятой Сталіцы на першым пляне стаялі праблемы, што датычылі Рэфармацыі, дарэчы, яны закранулі і ВКЛ, прытушыўшы ў самым пачатку яшчэ не сфармаваны культ мясцовага сьвятога.

Аднаўленьне і завяршэньне працэсу кананізацыі Казіміра адбылося ў час пантыфікату Клімэнта VIII, які перад тым быў папскім нунцыем у Рэчы Паспалітай і захаваў прыязныя сувязі з Кракавам і Вільняй. 15 сакавіка 1602 г. біскуп Бэнэдыкт Война адправіў у Рым пасла

# маліся за нас!

каноніка Рыгора Сьвянціцкага, а кароль Жыгімонт III у лісьце да папскага сакратара выказваў спадзяваньне, што кананізацыя адбудзецца хутка. Выдаткі на місію Сьвянціцкага са скарбца сьв. Казіміра склалі 700 польскіх злотых. Затое ўжо 7 лістапада 1602 г. зьявілася була «*Quae ad Sanktorum*», якая пацьвярджала факт кананізацыі сьв. Казіміра, дазваляючы шанаваць яго як сьвятога. У ёй зьмяшчаўся афіцыюм імшальны і брэвіярны і прызначалася сьвята на 4 сакавіка. У Вільні ў 1602–1603 гг. лютавала зараза, і таму капітула пры катэдры выехала з гораду. Біскуп Война і мноства людзей прыходзілі па заступніцтва да грабніцы сьв. Казіміра.

10 траўня 1603 г. канонік Сьвянціцкі прывёз з Рыма кананізацыйную булу і ўказаньні пра абрады і набажэнствы, якія павінны былі выконвацца ў гонар новага сьвятога, а таксама чырвоную шаўковую харугву *(labarum)* з выявай сьв. Казіміра на залатым полі на абодвух баках і зь гербамі Сьвятога Айца, Польскага Каралеўства, Вялікага Княства Літоўскага, Віленскага біскупства і Капітулы. Зьдзіўляюць яе памеры: у даўжыню 18 локцяў, шырынёй 9 локцяў. Бэнэдыкт Война прызначыў унясеньне рэліквій на алтар на 10 траўня 1604 г. За тры дні да ўрачыстасьці труна каралевіча была адкрыта, і выявілася, што яго цела цалкам захавалася; пры галаве ляжаў гімн, які сьв. Казімір часта прамаўляў на хвалу Маці Божай. Рэліквіі былі пакладзены на катафалк для ўсеагульнага пакланеньня. Тым часам езуіты рыхтавалі трыумфальную браму каля касьцёла сьв. Яна, яшчэ дзьве будаваліся ў горадзе. Урачыстая працэсія пачалася ад касьцёла сьв. Стэфана а 4-й гадзіне па поўдні. Такога шэсьця Вільня яшчэ не бачыла: велізарны натоўп, 32 цэхі і 5 брацтваў з харугвамі і абразамі, законы, войска, сэнатары, сьвятары і біскупы. Кананічную харугву нёс канцлер Леў Сапега, які прадстаўляў асобу караля. Ад касьцёла сьв. Стэфана працэсія выйшла да Рудніцкай брамы, убранай на падабенства лятучага птаха, і тут яе сустракала дзяўчына на трыумфальнай павозцы – увасабленьне Вільні. Пасьля гадзіннага тэатральнага дыялогу яна ўзначаліла працэсію, якая пад гукі музыкі, сьпеваў, званоў усіх касьцёлаў і салюта замкавых гарматаў выйшла на Рынкавы пляц. Тут, каля трыўмфальнай брамы, адбылася працяглая тэатралізаваная дзея з прамовамі і вершаванымі дыялогамі па-польску, пасьля чаго працэсія рушыла па вуліцы Вялікай у кірунку замкавага касьцёла. Па дарозе падобная дзея, з яшчэ большым размахам наладжаная езуітамі на лацінскай мове, прайшла каля касьцёла сьв. Яна. Перад уваходам у катэдру каля капітульнай брамы працэсію сустрэў біскуп Война, які ўзяў харугву з рук Сапегі і зьмясціў яе ў каралеўскай капліцы пры рэліквіях сьв. Казіміра. Назаўтра ў замкавым касьцёле адбылося ўрачыстае набажэнства з чытаньнем кананізацыйнай булы. Завяршылася ўрачыстасьць 12 мая закладкай касьцёла сьв. Казіміра на віленскім рынку. Біскуп Бэнэдыкт Война асьвяціў вуглавы камень, пакладзены рукамі самых паважаных магнатаў – сэнатараў.

Пазьней канонік Р.Сьвянціцкі паводле падораных вотаў запісаў засьведчаныя цуды, якія здарыліся пры грабніцы сьв. Казіміра (да 1627 г. ён налічыў 408 цудаў). Першы зь іх – уваскрашэнне Уршулкі, дачкі віленскага мешчаніна, адбылося яшчэ ў канцы XV ст. Былі і такія цуды. Кацярына Тэнчынская, жонка Юрыя Алелькавіча Слуцкага, аўдавела ў 1580 г. Праз некалькі гадоў у яе пачаўся галаўны боль, які мучыў яе цэлы год. Яна абяцала падараваць для грабніцы сярэбраную галаву ў натуральную велічыню, і боль прайшоў. Пазьней Тэнчынская выйшла замуж за гетмана Крыштофа Радзівіла, і іх дачка Альжбета ўратавалася ад сьмерці. Каралеўскі сакратар Мікалай Ясінскі ў 1600 г. захварэў у Варшаве на гарачку. Лекары ўжо адступіліся ад яго, аднак ён выжыў, молячыся да сьв. Казіміра. У 1603 г. той жа Ясінскі зьвярнуўся да сьвятога ў час эпідэміі жывёлы ў маёнтку Рэпля ў падзяку за ацаленьне апошніх 10 жывёлінаў, ад якіх вельмі хутка павялічыўся статак. Ясінскі падараваў срэбную лямпу да гроба. Яго слуга ў тым жа годзе ў Рэплі па малітве прысутнага ксяндза пазбавіўся ад падучай хваробы, якой мучыўся да 50 гадоў. У 1603 г. пры пераправе праз Нёман ўратаваўся канонік Рыгор Сьвянціцкі, які накіроўваўся ў Рым. На зваротным шляху карэта, у якой ехалі Сьвянціцкі, Ян Рудаміна і Мікалай Любамірскі, ледзь ня рухнула ў прорву па дарозе паміж Веронай і Падуяй, павісшы ў паветры на адным коле, аднак яе ўратаваў юнак у белым адзеньні, падобны да сьв. Казіміра.

Сярод вылечаных па малітве да сьв. Казіміра ў пачатку XVII ст. былі старасьціна Геранёнская Пясецкая, жонка маршалка слонімскага Рыгора Трызны Аляксандра, суфраган віленскі Мікалай Пац, кашталян Войцех Ракоўскі, ксёндз з Відзаў Павел Малішэўскі, староста мсьціслаўскі Пётр Пац, Аляксандра Масальская, Зоф'я Хадкевічава, Ганна Галоўчынская, Аляксандар Гасеўскі, Каспар Цеханавецкі і мноства простых людзей, вядомых толькі па йменах. Сьведчаньнямі сталі 407 вотаў.

**працяг на 4 стар.**

# Сьвяты Казімір...

Сінод Віленскай дыяцэзіі ў 1613 г. пастанавіў прызнаць патронамі Літвы сьв. Юрыя, сьв. Казіміра і сьв. Мікалая. У 1621 г. Павал V дазволіў зьмясьціць афіцыум сьв. Казіміра ў рымскім імшале і брэвіярыі, у 1636 г. Урбан VIII прызнаў сьв. Казіміра патронам Літвы, а Аляксандар VII (1655–1667) дазволіў адзначаць яго ўрачыстасьці ва ўсёй Рэчы Паспалітай. У XVII ст. культ сьв. Казіміра асабліва распаўсюдзіўся ў ВКЛ, набываючы грамадска-палітычны сэнс. Да яго як да нябеснага заступніка зьвярталіся ў час войнаў з ворагамі хрысьціянства ці агульнанацыянальных бедзтваў, законы хадзілі з працэсіямі да капліцы ў катэдры, сьпявалі суплікацыі для ўпрашэньня Божай міласэрнасьці. У 1604 г. Ян Кароль Хадкевіч, польны гетман, ідучы на інфлянцкую вайну, пайшоў у капліцу сьв. Казіміра, дзе, паклаўшы меч на труну, выслухаў Імшу і прыняў Сьв. Камунію, а затым папрасіў правесьці 40-гадзіннае набажэнства і ўжо пасьля гэтага пайшоў на вайну. 27 чэрвеня 1605 г. у бітве пад Кірхгольмам ён перамог шведаў. Кароль Ян Сабескі, які вырушваў пад Вену, папрасіў адпраўляць у капліцы сьв. Казіміра штодзённа ў 6 гадзін раніцы ўрачыстае набажэнства з выстаўленьнем Найсьвяцейшага Сакраманту для ўпрашэньня нябеснай дапамогі ў час яго паходу. Віленская капітула ў 1672 г. пастанавіла адпраўляць у час сеймаў Імшу за сьв. Казіміра.

Культ сьв. Казіміра ў Вялікім Княстве Літоўскім разьвівалі розныя законы, але найперш – езуіты. Ім належаў віленскі касьцёл, яны ж вынесьлі вядомасьць сьвятога за межы краіны. У 1652 г. за мілю ад Полацка, на месцы, дзе ў пачатку XVI ст. адбылося цудоўнае зьяўленьне сьвятога перад войскам, езуіты пабудавалі касьцёл сьв. Казіміра. Яму быў прысвечаны касьцёл дамініканцаў у Стоўбцах (1642 г., фундаваны Аляксандрам Слушкам), касьцёлы ва Ўселюбе і Ліпнішках, капліцы ў касьцёлах у Ражане (фундатар – віленскі ваявода Павал Сапега) і Коўне, алтары ў касьцёле езуітаў у Варшаве, у Неапалі ў касьцёле сьв. Юрыя (з рэліквіямі і статуяй сьв. Казіміра, прысланымі ў сярэдзіне XVII ст. біскупам Тышкевічам), у славутым сваімі званамі Мехелене ў Бельгіі (у 1691–1692 гг. сюды прыслаў рэліквіі біскуп Бжастоўскі).

Як мясцовага сьвятога з роду Ягелонаў сьв. Казіміра яшчэ да Замосценскага сабору шанавалі і ўніяцкія «Служэбнікі». Літургічная служба яму мела цалкам візантыйска-славянскую традыцыю. Літаратурную прыгажосьць гэтай сталай і традыцыйнай творчасьці падкрэсьліваў польскі дасьледчык А.Навумаў на прыкладзе тэкста з Жыровіцкага служэбніка пачатку XVIII ст.: «Иже во царских красотах от мирских сладостей плотских кринъ, девства сохранивый невредим и девей Богородицы тёплым желанием и всего любовію последовавый. Церкви же ревностию ти поборникъ крепок бывавый, полская и литовская похвало. Казиміре царевичу, моли Христа Бога церкви от насилія отступник невреждённей быти и царствъ сих правовернымъ жителем спастися».

Рэліквіі сьв. Казіміра спачатку захоўваліся ў каралеўскай капліцы, заснаванай каралём Казімірам і адбудаванай пасьля пажару 1530 г. Жыгімонтам I. Яна ацалела пры страшным пажары ў Вільні 1 чэрвеня 1610 г., калі згарэў дах на катэдры і лопнулі скляпеньні, а на званіцы растапіліся званы. У 1616 г. пачалі будаваць капліцу сьв. Казіміра, фундаваную каралём Жыгімонтам III. Ужо пры Уладыславу Вазу 15 жніўня 1636 г., у дзень Унебаўзяцьця Панны Марыі, у новую капліцу з дазволу папы Урбана VIII была перанесена труна са сьвятымі рэліквіямі. Адбылася працэсія па Вільні, ня менш ўрачыстая, чым у 1604 г., са сьпевамі гімнаў, пад музыку каралеўскага і катэдральнага аркестраў. Харугву сьв. Казіміра неслі адзін з пралатаў, Войцех Радзівіл і Стэфан Пац, каралеўскія знакі – скіпетр і карону – самыя відныя сэнатары. Перад труной ішоў кароль Уладыслаў IV з братамі Янам Казімірам і Фэрдынандам, а за імі – каралева. Казаньне прамовіў славуты красамоўца і лацінскі паэт прафесар Віленскай акадэміі Мацей Сарбеўскі. Прыгожую срэбную труну зьмясьцілі ў алтары, да якога каралева Канстанцыя падаравала вечную залатую лямпу. У 1652 г. Кангрэгацыя сьвятых абрадаў дазволіла адзначаць перанос рэліквій як другое сьвята Казіміра ў першую нядзелю па актаве Унебаўзяцьця Найсьвяцейшай Марыі Панны.

Пачынаючы ад канцлера ВКЛ Льва Сапегі, род Сапегаў стаў шчырым апекуном нацыянальнага сьвятога. Многія Сапегі пры хрышчэньні атрымалі імя Казімір. У 1654 г., калі войска Хаванскага набліжалася да Вільні, рэліквіі сьвятога былі вывезены на Жмудзь, а потым у Ружанскі палац Сапегаў, дзе і зьберагаліся да канца вайны. Пры рэстаўрацыі Віленскай капліцы асноўным фундатарам стаў гетман Казімір Сапега, што аплаціў працу майстроў-тынкоўшчыкаў, якія аздобілі купал і сьцены капліцы прыгожымі арнамэнтамі, а таксама заказаў срэбную труну для рэліквій сьвятога. На працягу амаль трох стагодзьдзяў унікальны рэлікварый стаяў на алтары катэдральнай капліцы сьв. Казіміра. Калі пасля 1945 г. віленская катэдра была ператворана ў карцінную галерэю, труна сьв. Казіміра знаходзілася ў касьцёле сьвятых Пятра і Паўла на Антокалі. У канцы 1980-х гадоў яна была ўрачыста вернута на сваё спрадвечнае месца.

**Паводле:**
**Аляксандр ЯРАШЭВІЧ,**
**СЬВЯТЫ КАЗІМІР У ГІСТОРЫІ І МАСТАЦТВЕ**
**часопіс «Наша Вера» 1(19)/2002**

# Глядзець ці не глядзець?



Нашае сучаснае жыцьцё – гэта ня проста жыцьцё паміж роднымі і знаёмымі, дома ці на працы, і перад Божым позіркам на нас. Нашае жыцьцё – гэта таксама жыцьцё сярод мноства сродкаў камунікацыі. Раніцу мы пачынаем з газэты, на працы слухаем радыё, а увечары бавім час перад тэлевізарам. Тэмы, якія мы абмяркоўваем са знаёмымі, датычацца прагледжанага сэрыялу ці здарэньняў у далёкай ад нашага асабістага жыцьця сфэры ці ўвогуле за акіянам. І пытаньне ў тым, ці застаемся мы тымі самымі людзьмі, калі большая частка нашай сьвядомасці занятая тымі тэмамі, якія абіраюцца і прасоўваюцца ў сродках масавай інфармацыі.

Магчыма, гэта нельга было б успрымаць як сур'ёзную праблему, каб склад телеперадачаў, характар музыкі на радыё і тэмы газэтных публікацыяў спрыялі разьвіцьцю духоўнаму і інтэлектуальнаму. Але індустрыя сродкаў масавай камунікацыі трымаецца за рэкляму, таму барацьба за памер аўдыторыі часта вядзецца такім чынам, што ўжываюцца найбольш яркія, прымітыўныя, але дзейныя сродкі прымушваньня да таго, каб мы зьвярталі на увагу. Робіцца гэтае на самым простым, фізычным узроўні. Калі мы бачым каляровую картынку, хуткі рух, гвалт, крымінальны сюжэт ці эратычную сцэну, гэта можа выклікаць самыя розныя эмоцыі, і за кошт гэтага будзе ўтрымоўваць нашую увагу. Таму ў барацьбе за аўдыторыю розныя сродкі масавай інфармацыі забываюцца на сваю адукацыйную і выхаваўчую ролю, для прываблiваньня аудыторыі выкарыстоўваюць тэмы і прыёмы, якія годныя толькі таго, каб утрымаць чалавека ля экрану.

Зразумела, цікавасьць у большасьці вызывае не спакойнае, духоўна насычанае жыцьцё, а скандалы, здрады, інтрыгі і крымінальные абвесткі. Таму мы выхоўваемся з уяўленьнем, што тая мадэль паводзінаў, якую мы бачым на экране ці чуем у папулярнай песьні, і ёсць сапраўднае, нармальнае жыцьцё. Дарослы чалавек, у жыцьці якога, тым больш, ёсьць час на малітву, мае магчымасьць вырвацца з гэтага кола штодзённасьці, падняцца над сабой і зразумець сапраўдную вартасьць таго, аб чым ён думае, размаўляе ў жыцьці, вярнуцца ў сваей сьвядомасьці да сапраўднага і важнага. Але што рабіць дзеткам, якія могуць ня мець духоўных сілаў, каб асвабадзіцца ад усяго гэтага?

Канечне, зусім ня правільна пазбаўляць сучаснага чалавечка магчымасьці атрымоўваць розную інфармацыю, якая адкрытая для ўсіх астатніх. Дзякуючы інфармацыі, якую мы бярэм адусюль, мы арэентуемся ў сучаснасьці. Зусім маленькія любяць глядзець мульцікі, таму што гэта вельмі падобна да казак, на якіх выраслі папярэднія пакаленьні. Мульцікі таксама ўплываюць на выхаваньне дзяцей, бо іх героі паказваюць, як трэба весьці сябе ў тых ці іншых выпадках (канешне, гэта не датычыцца тых шматлікіх мультсэрыялаў, асноўная тэма якіх – гвалт). Забараняць дзецям глядзець тэлевізар нельга і таму, што забаронены яблык заўсёды салодкі.

Але вельмі страшна, калі бацькі пакідаюць дзіця на выхаваньне тэлебачаньню толькі таму, што гэта дазваляе ім займацца сваімі справамі, не гуляцца з малым і не адказваць на мноства пытаньняў, якімі дапякаюць бацькоў цікаўныя дзеткі. Усе сродкі камунікацыі павінны ўспрымацца не як першая і галоўная рэальнасьць, а толькі як сродкі перадачы інфармацыі, да якой трэба ставіцца самастойна і якой нельга бязьмерна давяраць. Каб пазьбегнуць шкоднага уплыву тэлебачаньня на дзяцей, трэба тлумачыць і прывіваць ім асноўныя, галоўныя духоўныя вартасьці, вучыць быць адказнымі за сябе і самастойнымі у сваіх меркаваньнях. Але такой цяжкай задачы можна дабіцца толькі асабістым, аўтарытэтным бацькоўскім прыкладам і павагай да дзяцей.

**Алена АРЦЁМЕНКА**

# Вільня – духоўны цэнтар каталіцтва

**Да рук Тваіх па лесьвіцы вузкай**
**Узношу, аж сэрца стыне,**
**Тугу душы маёй беларускай,**
**Адлучанай ад сьвятыні.**



Гэтыя радкі Дануты Бічэль-Загнетавай прысьвечаныя вобразу Найсьвяцешай Марыі, Вострабрамскай Пані, рэлíквіі і сымбалю Вільні – былой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. Горад гэты ня толькі захаваў хараство і веліч даўніны, якой захапляўся не адзін паэт, але да гэтага часу застаецца духоўным цэнтрам, месцам пілігрымак, дзе душа знаходзіць пакой і суцішэньне. Вузкія вулачкі сярэдневечнага горада вядуць у іншы незвычайны свет – прыгожы і таямнічы...

Цудадзейны вобраз Божай Маці знаходзіцца ў каплічцы над Вострай Брамай. Гэтая брама – рэшткі абарончых муроў, якімі быў акружаны горад, што ня раз перажываў навалы ворагаў. Менавіта падчас вайны ВКЛ са шведамі манахі кармеліцкага ордэну і памясьцілі вобраз Божай Маці на гарадзкім муры. З тых часоў да Вострай Брамы з адарацыяй і просьбамі прыходзяць вернікі, прычым абедзьвюх канфэсіяў – Божая Маці аб'яднала каталікоў і праваслаўных.

Гэта яшчэ адна асаблівасьць Вільні – разнастайнасць ва ўсім, пачынаючы ад архітэктанічнага стылю будынкаў, заканчваючы веравызнаньнем, нацыянальнасцю, мовай і культурай яе насельнікаў. На шчасьце, бурлівае XX стагоддзе амаль не парушыла гэтае гарманічнае суіснаваньне, і нават зараз тут часта можна пачуць акрамя літоўскай мовы польскую, рускую, ды беларускую гаворку.

Напэўна таму, калі прыязджаеш у Вільню, узьнікае адчуваньне, што вярнуўся дадому, у даўно знаёмае і любімае месца. Паўсюль спатыкаеш "беларускія месцы": гімназію, у якой настаўнічаў Максім Гарэцкі і вучылася Натальля Арсеньнева (аўтарка гімну "Магутны Божа"), будынак, дзе разьмяшчалася друкарня Францішка Скарыны, могілкі ў Росе, дзе спачываюць браты Луцкевічы, якія выдавалі на пачатку мінулага стагодзьдзя першую беларускую газэту "Наша Ніва", дамініканскі кляштар, у якім трымалі арыштаванага Кастуся Каліноўскага, а яшчэ раней – удзельнікаў тайнага Таварыства Філарэтаў, што аб'яднала ў свой час у імя барацьбы за волю Айчыны многіх студэнтаў-выхадцаў зь Беларусі (Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ігнацы Дамейка).

Гістарычныя зьмены ў некаторым сэнсе сапраўды "адлучылі ад сьвятыні" беларускую душу: ад хараства касьцёла сьв. Ганны, мініяцюрнага карункавага гатычнага храма, які, па легендзе, Напалеон марыў "занесьці на далоні да Парыжу"; ад велічы касьцёла сьв. Пятра і Паўла, пэрлы барока, ягонай прыгажосьці, якая адначасова нагадвае пра мізэрнасьць і марнасьць зямнога існаваньня; ад вобразу Езуса Міласэрнага (вобраз Божай Міласэрнасьці) ў касьцёле сьв. Духа, намаляванага паводле апісаньняў сястры Фаўстыны Кавальскай. Але ці існуюць граніцы для веры? Канешне, не! Вобраз Божай Маці Вострабрамскай дарагі кожнаму сэрцу беларускага каталіка. Няма ніякіх перашкод для "духоўнай пілігрымкі" да Вострае Брамы, дзе мы можам знайсьці ў кожную хвіліну суцішэнне і супакой, ахвяраваўшы сябе Маці Міласэрнасьці.

**Алена СЫСОЙ,**
**фота - Юлія МАРКЕВІЧ**

### Малітва да Найсвяцейшай Марыі, Вострабрамскай Панны

*О Пані мая, Сьвятая Марыя, Тваёй ласцы, міласэрнасьці і Твайму асабліваму заступніцтву сёньня, і кожны дзень, і ў хвіліну маёй сьмерці я павяраю свае душу і цела. Усе надзеі і суцехі мае, усе смуткі і цяжкасьці, жыцьцё і канец жыцьця майго аддаю ў Твае рукі, каб праз Твае заслугі ўсе мае ўчынкі былі накіраваныя на выкананьне Тваёй і Твайго Сына волі. Амэн.*

# DLACZEGO MODLITWA I POST?

**Dlaczego nie możemy osiągnąć pokoju? Dlaczego nie możemy wypędzić demona głuchego na nasze zabiegi?**

Na pytanie o przyczynę niepowodzenia Jezus daje rozczarowanym uczniom krótką odpowiedź: „Ten rodzaj demonów można wyrzucić tylko modlitwą" (Mk 9,29). Słowa o modlitwie są dość zagadkowe. Dodatkowy warunek „i postem" nie rozjaśnia wcale ich znaczenia.

Czy uczniowie pominęli jakąś konieczną modlitwę albo opuścili jakiś szczególny czyn pokutny, kiedy usiłowali wyrzucić demona? Przecież wyrzucając tego samego demona, Jezus nie wypowiedział żadnej modlitwy (Mk 9,24). Podobnie było ze wszystkimi wcześniejszymi egzorcyzmami. Były one skuteczne bez wypowiadania formuł modlitewnych (Mk 1,25—26.34.39; 3,11; 5,8—13). Kiedy Jezus przekazywał Apostołom władzę nad demonami, nie stawiał żadnego warunku skuteczności (Mk 3,15). W czasie pierwszej działalności misyjnej Apostołowie wypędzali demony bez posługiwania się modlitwami (Mk 6,13). Cała działalność Jezusa pokazuje, że nie chodzi o jakąś modlitewną receptę egzorcysty.

Powód, dla którego modlitwa jest konieczna, staje się jasny, kiedy rozumiemy, co oznacza modlić się. Jezus wzywa uczniów do takiej modlitwy, w której wnętrze człowieka nie jest podzielone, lecz oddane całkowicie Bogu (Mk 11,23; 14,38). Jezus nie tylko mówi o modlitwie, ale własnym życiem ukazuje, na czym ona konkretnie polega. Nawet wtedy, kiedy nie znamy treści Jego modlitwy, czyny z niej wypływające są znakiem Jego pełnej jedności z Bogiem. W Ewangelii Marka dwa razy jest wzmiankowana nocna modlitwa Jezusa bez podawania jej treści: po pierwszym razie, odrzucając sugestię Piotra powrotu do przyjaznego Mu Kafarnaum, Jezus wskazuje na konieczność wypełniania Bożego planu (Mk 1,38); po drugim razie kroczy po jeziorze, aby ukazać uczniom swą Bożą naturę (Mk 6,48.50). Jeden raz są podane słowa Jego modlitwy: „Abba, Ojcze, dla Ciebie wszystko jest możliwe, zabierz ten kielich ode Mnie! Lecz nie to, co Ja chcę, ale to, co Ty!" (Mk 14,35). Wyrażają one pragnienie poddania Bogu własnej woli, czyli tego jedynego, czym człowiek w sposób wolny rozporządza i Bogu wcale oddać nie musi.

Modlitwa jest doskonałym podporządkowaniem woli Bożej wszystkich dążeń i całej niepodzielonej woli człowieka. Modlitwa nie jest pojedynczym aktem izolowanym od pozostałych czynów człowieka. Nie jest przestrzenią kultu oddzieloną od reszty jego egzystencji. Modlitwa jest zorientowaniem całego istnienia człowieka na Boga, jest wyrazem dążenia do pełnej jedności z Nim.

Skuteczność egzorcyzmów dokonywanych przez Jezusa była znakiem takiego zjednoczenia z Bogiem. Zwyciężanie duchów nieczystych wskazywało na obecność w Nim Ducha Czystego. Właśnie tej jedności z Bogiem i obecności Ducha Świętego nie chcieli uznać Jego przeciwnicy, kiedy oskarżali Go o pakt z Belzebubem (Mk 3,23). Dlatego, chociaż nie wypowiedzieli wprost żadnego słowa przeciwko Trzeciej Osobie Boskiej, ich słowa były bluźnierstwem przeciwko Duchowi Świętemu (Mk 3,29).

Wracając do przyczyny niepowodzenia uczniów i nieskuteczności naszych modlitw, możemy lepiej rozumieć słowa Jezusa: „Ten rodzaj demonów można wyrzucić tylko modlitwą". Modlitwa rozumiana jako jedność z Bogiem, dążenie do niej i pragnienie jej zachowania jest warunkiem skuteczności naszego przeciwstawienia się złu. Aby pokonać zło zewnętrzne, nie można być mu poddanym wewnętrznie, trzeba od niego się odwrócić, czego znakiem jest post i różne formy pokuty. Przede wszystkim trzeba niepodzielnie należeć do Boga, poddawać własną wolę Bożej woli: a to jest modlitwa. O takie wewnętrzne odwrócenie się od zła i zwrócenie się do Boga chodzi w wezwaniu Jana Pawła II.

**Ks. Artur Malina**
**www.opoka.org.pl**

*Wiemy, że modlitwa nabiera większej siły, jeśli towarzyszą jej post i jałmużna. Tak uczy Stary Testament, a chrześcijanie już od pierwszych wieków słuchali tego pouczenia i stosowali je, szczególnie w okresie Adwentu i Wielkiego Postu. Ze swej strony wyznawcy islamu rozpoczęli właśnie ramadan — miesiąc poświęcony postowi i modlitwie. My, chrześcijanie, wejdziemy niebawem w Adwent, aby przygotować się modlitewnie do obchodów Bożego Narodzenia, dnia narodzin „Księcia Pokoju". W tym czasie tak bardzo odpowiednim proszę katolików, aby 14 grudnia przeżyli jako dzień postu, w czasie którego będą się gorąco modlić do Boga, aby dał światu trwały pokój, oparty na sprawiedliwości, i aby w ten sposób sprawił, że możliwe będzie znalezienie odpowiednich rozwiązań licznych konfliktów, nękających świat. To zaś, czego wyrzekniemy się w czasie postu, będzie można przekazać ubogim, zwłaszcza tym, którzy cierpią obecnie w wyniku terroryzmu i wojny.*

**Jan Paweł II przed modlitwą „Anioł Pański"**
**18 listopada 2001 r.**

| Сакавік 2010 | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Нядз. | Пан. | Аўт. | Сер. | Чацьв. | Пятн. | Суб. |
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 сьв. Казіміра | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 Сьв. Юзафа | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 Абвяшчэньне Пана | 26 | 27 |
| 28 Пальмовая Нядзеля | 29 | 30 | | | | |

*Любоў — гэта сутнасьць самога Бога, сэнс стварэньня і гісторыі, сьвятло, якое надае прыгажосьць жыцьцю кожнага чалавека. Калі мы думаем аб сьвятых, то пазнаём разнастайнасьць духоўных дароў, якія яны мелі. Жыцьцё кожнага зь іх — гімн аб любові, жывая песьня аб любові Пана.*

**Бэнэдыкт XVI**

# Сьвяткуем Вялікдзень разам!

2010 год — адзін з тых, калі праваслаўныя і каталікі будуць сьвяткаваць Вялікдзень разам. Сёлета гэтая ўрачыстасьць прыпадае на 4 красавіка. У гэты дзень гучным звонам з усіх цэркваў і касьцёлаў сьвету будзе абвешчана вялікая радасьць — Хрыстос Уваскрос!

Часта паўстае пытаньне, чаму каталікі і праваслаўныя ў нашай краіне звычайна адзначаюць Пасху зь вялікай розьніцай дзён і толькі раз на нейкі час дата ўрачыстасьці супадае.

Справа ў тым, што Вялікдзень — гэта рухомае сьвята. Яго дата неаднойчы ў гісторыі была тэмай спрэчак. У нашы часы ў заходніх Касьцёлах прынята, што Вялікдзень адзначаецца ў нядзелю пасьля першай вясеньняй поўні месяца. Дата ўрачыстасьці Уваскрасеньня Хрыста залежыць таксама ад даты Укрыжаваньня, якое, як пішуць Эвангелісты, адбылося на тры дні раней — непасрэдна перад габрэйскай Пасхай, якая адзначалася ў чатырнаццаты дзень месяца Нісан. Ад-



нак праблема заключаецца ў тым, што дата Укрыжаваньня ў Эвангельлі паводле Яна і ў іншых трох адрозьніваецца. Таму ўсходнія Касьцёлы выказваліся за дату чатырнаццаты Нісан, а заходнія прывязвалі адзначэньне ўрачыстасці Ўваскрасеньня да пятнаццатага дня гэтага месяца.

Пералом у вызначэньні дня Пасхі зьдзейсніў манах па імені Дыянізій. Ён стварыў хрысьціянскі каляндар, пачынаючы адлік ад Нараджэньня Хрыста. Каб атрымаць дату Вялікадня, сярэднявечны хранолаг шукаў так званую залатую лічбу, зьвяраў па табліцы дату поўні месяца, потым шукаў першую поўню пасьля 21 сакавіка і затым ў табліцы так званых літар нядзелі адшукваў дату Вялікадня.

Пасьля рэформы календара шляхі Ўсходу і Захаду, што датычаць адзначэньня Пасхі, разышліся. Розьніца ў сьвяткаваньні Вялікадня паміж Каталіцкім Касьцёлам і тымі Праваслаўнымі Цэрквамі, якія карыстаюцца Юліянскім календаром, можа складаць нават пяць тыдняў. Але можа і супадаць, як адбываецца і сёлета.

Зьяўляюцца тэндэнцыі, каб увесьці сталую дату Вялікадня. Варта адзначыць, што Канстытуцыя аб Сьвятой Літургіі Другога Ватыканскага Сабору цалкам дапускае такую магчымасьць.

**Паводле Catholic.by**

**PATER NOSTER**
газэта ствараецца хрысьціянскай моладзьдзю

*штомесяцовы бюлетэнь парафіі сьвятога Казіміра ў Жлобіне*

Заснавальнік - кс. Леанард Акалатовіч; галоўны рэдактар - Алесь Карцель; выпускны рэдактар - Алена Арцёменка; макетоўшчык, карэктар - Алесь Карцель. Адрас: 247210, Гомельская вобл., г. Жлобін, вул. Юных піянэраў, 24. Тэл./факс: (02334) 2-94-84. GSM: (029) 630-87-79. e-mail: centrum.pn@gmail.com. Выдаецца зь ліпеня 2004 г. на беларускай (клясычны правапіс) і польскай мовах. Надрукавана на ксэраксе. Наклад: 299 асобнікаў.